Алена Белая

# КНІГА ЖОНКІ ПАЭТА



Баранавічы

2007

ББК 84(4Беі)
Бел 43

Белая Алена.
Кніга жонкі паэта. – Баранавічы : Баранавіцкая гарадская арганізацыя Грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны", 2007. – 132 с.

ББК 84(4Беі)

© Баранавіцкая гарадская арганізацыя Грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны", 2007.
© Мастацкае афармленне Алены Татарыновіч, 2007.

Таварыства беларускай мовы

імя Францішка Скарыны

# ЗМЕСТ

## Замест пралогу

Сны аб Беларусі ў канцы ХХ стагоддзя ....................................7

## Паэзія

. . . "Водар ліпнёвы ягад" ..............................................................16

### ПЯШЧОТНАЕ

"Ужо не апалю" ...................................................................................18
Дзевяць дзён у Гурзуфе ......................................................................20
. . . "Зляпіла зіма сакавік – абы з рук!" .........................................22
. . . "Адбрыкнуцца лянотна" ..........................................................23
Амаль пераймаючы Скарыну ...........................................................24

### СІМФАНІЧНАЕ

Жаночая маналогіка ............................................................................26
. . . "Вот город, то сумрачный, то освещённый" ......................27
. . . "Тваё "Алёна" ................................................................................28
. . . "Шпарка мільгаюць жыцця берагі" ..........................................29
ПадСУМоўванне .....................................................................................30
. . . "От скорби душу отскрести" ..................................................31
. . . "Когда-нибудь не будет, как когда-то" ...............................32

### СУЗІРАЛЬНАЕ

Зімовая фантасмагорыя ......................................................................34

Абразок ........................................................................35
У Тураўскім музеі, або Хоку па-беларуску ..............................36

## НАСТАЛЬГІЧНАЕ

Думкі ў вандроўцы ..........................................................38
. . . “Раскашуе слядоў суквецце” ...............................................39
Вяртанне ў дзяцінства .......................................................40

## МІНОРНАЕ

. . . “Кахаю – і спадзяюся” ...........................................................42
. . . “Мялю ўпарта жарству пакуты” .................................................43
. . . “Не выпадае махнуць рукой” ....................................................44
. . . “Мо, табе страпянуцца” ........................................................45
. . . “Я отдала последний цент” .....................................................46
. . . “З сон-травою, бы сон, паляны” ...............................................47
. . . “Даўні той студзень зблытаў сляды” .......................................48
. . . “Сур’ёзная. Сталая. Немаладая” ...............................................50
Каханне ........................................................................51

## АБВІНАВАЎЧАЕ

. . . “Как далеко остался день” ...................................................53
. . . “Я каля Вас адзінотай змучана” ...............................................54
. . . “Ты праз далоньку, блізенька” ...............................................55
. . . “Маё святое аўтарскае права” ...............................................56

## ПРЫМРОЕНАЕ

. . . “Вечар прасуе вуліцы” ........................................................59

**ПРЫТОЕНАЕ**

. . . "Как до меня сказал поэт" ....................61

**ВІНАВАТАЕ**

2004-й ....................63
. . . "Циничный романтик" ....................64
. . . "Кастрычніцкім празрыстым ранкам" ....................65

**МАЖОРНАЕ**

. . . "Вслух рассуждать – вызывает сомненья" ....................67
Нявыдуманая гісторыя ....................69
. . . "Ў маіх асенніх нябёсах" ....................70
. . . "Чем пишет судьба?" ....................71

**Проза**

*Апавяданне*

Сачыненні ....................72

*Старонкі ненапісанага рамана*

Сублімацыя , або З хронікі маршрута № 7 ....................78
Не казка ....................83
Акватория надежды ....................88

**Замест эпілогу**

Рэцэнзія ....................98

Замест пралогу

## СНЫ АБ БЕЛАРУСІ
## Ў КАНЦЫ XX СТАГОДДЗЯ

Гэта не споведзь ідэальнага беларускага інтэлігента. Я — тыповы "прадукт" застою і не пакутніца за нацыянальную ідэю. У 70-я разам са сваімі аднагодкамі натхнёна спявала "Мой адрес — Советский Союз". І дзеці мае па-беларуску не размаўляюць. А я і не цісну на іх: супраць волі чалавека, гвалтам, не зробіш яго нават шчаслівым. Але ўсё маё жыццё — перад імі, і я спадзяюся, што яны гэтак жа вызначацца і ва ўласным, гэтак жа пачуюць сваё беларускае сэрца.

А я — руская. Праўда, у дадзеным жыццёвым выпадку гэта гучыць як анекдот "Негр загарае". Бо пры ўсякім новым знаёмстве першым пытаннем я чую: "Вы настаўніца?", а другім: "Беларускай мовы?" Часам яны аб'ядноўваюцца, і, я думаю, прычына не толькі ў нашым невыкараняльным нават на самым высокім дзяржаўным узроўні беларускім акцэнце (як выказаўся нехта з расійскіх пісьменнікаў, будучы ў Мінску: "Слова-то, вроде, русские, а вот язык..."

Так, я настаўніца роднай мовы і літаратуры, і мой стаж дазваляе мне пэўным чынам убачыць некаторыя праблемы.

Адна з іх — інтэграцыя з Расіяй, якая, магчыма, сёння фарсіруецца не з такой хуткасцю, як тады, калі нараджаліся гэтыя радкі. На думку дылетанта ў паліталогіі, імпэт самых вялікіх інтэгратараў значна ачах, прынамсі, яго знешнія праявы. Аднак па-ранейшаму вусцішна ад спакойных разваг некаторых суайчыннікаў, накшталт: “У гісторыі цывілізацыі былі выпадкі, калі слабыя народы растваraліся ў больш моцных”. А як быць таму, хто не адчувае гэтай самай слабасці? Не хоча раствараццa? Калі адчувае сілы і хоча аддаць іх на карысць СВАЁЙ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ? І калі выразна разумее пры гэтым, што з правамі меншасці ў нашым грамадстве яшчэ горш, чым з усімі астатнімі?

Інтэлігенцыя — аб’ектыўна прыхільнік прагрэсу, носьбіт прагрэсу. Яна усведамляе, што ў імя прагрэсу некаторыя слабыя народы паглыналіся больш моцнымі. І каму ў такім выпадку справа да самотнага беларускага сэрца? Хаця я — руская. Прынамсі, магу сцвярджаць, што ўва мне палова расійскай крыві: бацька — ураджэнсц паўднёвага Урала (дзе я ніколі не была) і, як казаў пры жыцці, зямляк Ельцына. Прозвішча маё — Барадзіна — ну проста ад герояў Маркава ці Шолахава. Павінна, здавалася б, адчуваць моцны покліч продкаў, а Таццяну Дзьячэнка лічыць ледзь не за стрыечную сястру.

Але на маім стале не Маркаў і не Шолахаў, а перш Канчэўскі, Дубянецкі, Каратке-

віч. Я знаходджу ў іх сябе, але гэта асобная, доўгая і шчымлівая размова.

Я памылкова сеў не ў той вагон,
Не ў той вагон і не на тым паўстанку…
І нехта паўтарае безупынку,
Што я павінен скокнуць на хаду,
А не чакаць наступнага прыпынку.

*Гэтыя радкі М. Федзюковіча — і пра сябе, і пра тых, хто трагічна апярэдзіў свой час.*

А мяне не ў свой вагон пасадзілі супраць маёй волі. І безумоўна ж, дбаючы аб маім асобным сярод усеагульнага шчасці. У час чарговага перапісу, у самы росквіт застою, мяне настойліва запісвалі рускай. “По отцу!” — пераконвала чыноўніца. Пры абмене пашпарта ўжо ў 8О-я я паспрабавала напісаць у картцы “беларуска”, але пільнае наменклатурнае вока ўсё ж згледзела “фальсіфікацыю”. Так і жыву з беларускім сэрцам і неадпаведным яму запісам у адпаведнай графе. Камусьці гэта было трэба?

…Я – залатая медалістка. І ў прыёмнай камісіі правінцыйнага тады педінстытута, якому сёння ёсць чым ганарыцца, у тым ліку і універсітэцкім статусам, мяне ветліва пытаюць: “Вы не ошиблнсь? Возможно, вы поступаете на русское отделение?” Але і беларускае, хоць і колькасцю адна група на патоку, існавала. Памятаю, як журыліся мы, што ў нашых вёсках школы ўвачавідкі робяцца рускімі. Але

мудры Антон Лукіч Юрэвіч суцяшаў нас: “Нічога, дзяўчаткі, на ваш век хлеба хопіць, ды яшчэ з маслам”. Хлеба і праўда хапіла, хоць часам і гаркаватага. Я хаваю пажоўклую “Народную (яшчэ тую, народную!) газету” з артыкулам Сяргея Законнікава “Беларускае сэрца”. Ён пра тых, хто “ўвесь час былі абдзелены ўвагай, разуменнем, маральнай падтрымкай, якія штодзённа адчувалі дыскрымінацыю, выслухвалі здзеклівыя заўвагі і кпіны з боку сваіх калег і нават вучняў, але...” Але зноў і зноў адчынялі дэверы школьных класаў і неслі туды беларускае слова. Часам горка было і ад кампліментаў, якія гучалі прыкладна так: “Я думала, што вы выкладаеце этыку ці англійскую, а вы...” Шчырае здзіўленне маладзенькай практыканткі. Сёння такія складаюць пераважную большасць таго, што называецца электаратам.

Было і масла, у сэнсе бальзаму на душу, у пачатку 90-х. Настаўнікі беларускай мовы людзьмі зваліся.

Я – не дысідэнт. Вывучала і выкладала спадчыну Брэжнева і чытала вучням:

Дзве мовы у мяне —
Жыцця майго асновы,
Мне іх не разарваць,
Як рэчышча крыві.
Они слились во мне
Ў паток адзінай мовы,
Адзінай мовы братства и  любви..

Я мела малодшага па ўзросце брата, таму не адразу прыйшло ўсведамленне, што з двух братоў эвычайна заўсёды адзін старэйшы. У нашым варыянце - заўсёды адзін і той жа. І сёння мне хочацца працытаваць зусім іншыя радкі, народжаныя ў такім жа, як і мой, роздуме:

Я не ведаю, хто будзе
Аб Русі знябытай плакаць,
Мо Распуцін ці Бялоў…
Я, напэўна, не заплачу,
Хоць і я ў сваім багне
Мала што пад небам значу…

Л. Галубовіч. "Саюзная элегія"

Лепшыя гады майго жыцця прайшлі ў інтэрнацыянальным вайсковым гарадку, і я не кіну каменя ў сяброў маёй маладосці. А як радасна было недзе ў Тэрмезе сустрэць амаль суседа з Зэльвы ці Слоніма! І якое значэнне мела, Іваноў ён ці Абрамян? Але вось "малюнак з натуры". У час апошніх выбараў чую ў суседняй кабіне: "Да вычеркивай всех. Все они здесь одинаковые дебилы". Вымаўленне чыстае, расійскае. Вось так мае сённяшнія суседзі, адстаўныя ваенныя лётчыкі, вырашаюць мой лёс. У такіх выпадках каўказец хапаецца эа зброю. А беларус? У яго ёсць улюбёнае выйсце: паказаць пану ў кішэні кукіш. І я не знаходжу нічога лепшага, як прагаласаваць за прадстаўніка амаль збанкрутаванага на той час БНФ. Я — руская?..

Дарэчы, пра БНФ, і не толькі. Выкладаючы сваім “замежнікам” методыку літаратуры, я кажу ім, што беларус-славеснік — гэта не прафесія, а місія. І калі ты не ў БНФ, то “молва тебя запишет”. Прычым неістотна, ліберал ты ці радыкал. Абавязкова цябе будуць лічыць апазіцыянерам і патэнцыяльным нацдэмам. А калі ты жанчына, то мужчыны палічаць за абавязак дасылаць табе паштоўкі выключна з выявай Скарыны. Нават 8 Сакавіка. Праўда, зварот “шаноўная пані” многае кампенсуе.

Дарэчы, пра пані. Некалі бабуля ціхенька, але з гонарам гаварыла, што паходзіць з патомнай шляхты. Яна не лічыла гэта ганьбай, як многія вакол, але мы яе не разумелі, “унукі” Суворава, Чапаева, Паўліка Марозава.

Мая бабуля, вечная працаўніца і цярплівіца, хай гэтыя радкі будуць маёй запозненай данінай любові і павагі! Цяпер я, бадай, цалкам разумею цябе, і мне сорамна за многае, у тым ліку за кпіны з твайго вымаўлення выхаванкі Марыінскай жаночай гімназіі, у якім, здавалася, зрокава паўставалі старасвецкія “ер” і “яць”…

Але, як ні сумна, радавод да пятага калена я, як і мае сучаснікі, наўрад ці здолею скласці. Нават мая маці няшмат расказала мне аб сваіх бацьках. “Час быў такі…” Зручная для некага формула. Каму гэта трэба: затлуміць, задушыць бытам? Наўрад ці скрануся я ў гэтых пошуках далей, чалавек з правінцыі, які патанае ў клопатах пра хлеб надзён-

ны. “Хлеб наш насушчны, усіх нас пасушыць”, — згаджаешся з горкай іроніяй Кузьмы Чорнага…

Я — не ідэал. І наўрад ці маю права называцца інтэлігентам, не маючы за плячыма трох універсітэтаў: дзеда, бацькі, уласнага… І ўсё ж я іх няўлоўна адчуваю, бо ў самым раннім дзяцінстве ад свайго дзеда пачула на памяць “Анчар” і “В глубокой теснине Дарьяла”, якія гэтак жа памятаю чацвёрты дзесятак год. А што чуюць сённяшнія ўнукі ад сваіх “электаратных” дзядоў? Рытарычнае пытанне.

Дакладна ведаю, што прадзед, актывіст новай улады, быў ёю ж знішчаны на Салаўках, там жа загінуў і дзедаў брат.

Часам заўважаю ў сваім сыне, дзіцяці тыповых “саўкоў”, дзіўныя рысы: цягу да вытанчаных рэчаў, карцін - тое няўлоўнае, што называюць пародай. Некаторыя адзначаюць гэта і ўва мне. Але я больш адчуваю сябе сялянкай. І, думаецца, гэтае ўсведамленне жывіцца генетычнай памяццю. Можа, яна якраз ад уральскай бабулі Анны, якую я ніколі ў сваім жыцці не бачыла? І тады я — руская? З тых не разбэшчаных калгасным ладам расійскіх сялян, аб якіх так годна апавядаў мне некалі бацька. З тых, хто, адчуўшы пякельнае дыханне новай дзяржаўнай машыны, пазбаўляўся зямлі, гаспадаркі, падаваўся ў горад, ратуючы дзяцей, і паміраў заўчасна, знудзіўшыся па карміцельцы. Некалі

Сталін сказаў: “У селяніна няма рабскай прывязанасці да зямлі”. І ўсё ж яна ёсць. Яе не здолелі вынішчыць. Дваццаць год жыву я ў горадзе, і ўсё ж ува мне выжыла беларуская сялянка, пераадолеўшы моду заехаць як мага далей і пасяліцца як мага вышэй ад роднай зямелькі.

Да таго як займець свае 10 сотак, я часта прасіла гарадскіх сяброўак узяць мяне на дачу пакорпацца ў зямлі для душы, і “ў гэтым месцы” яны мяне не разумелі, бо бачылі ў такім занятку абрыдлую працу. Безумоўна, не хацелася б дапускаць блюзнерскай думкі, што да зямлі ўжо цягне па іншай прычыне...

Усё мяняецца ў наш час імкліва. Учарашнія героі становяцца “кучкай авантурыстаў”. Я з жахам думала: хутка да яе ж далучаць і Кастуся Каліноўскага, дабяруцца і да яго. Але, перачытаўшы “Мужыцкую праўду”, з палёгкай уздыхнула. Зямля і прыватная ўласнасць — вось грунт дабрабыту для мужыка, лічыў Яська — гаспадар з-пад Вільні. Не парабак, не пралетар. Гаспадар! Сваё — гэта агульначалавечая каштоўнасць і стымул прагрэсу, сцвярджаюць сучасныя філосафы. І таму мара мець на сваіх сотках дамок і бэз пад расчыненым акном сёння ўжо не называецца мяшчанствам. А як, бывала, абараняла годнасць гэтага саслоўя мая бабуля, калі мы з сястрой у саўковым эапале крычалі: “Мещанство!”

У студэнцтве я ніяк не магла атрымаць “выдатна” па замежнай літаратуры, бо не разуме-

ла (і вечна выцягвала) пытанне: “Лёс маленькага чалавека ў паваротныя моманты грамадскага быцця”. На сёння некалькі такіх паваротаў я ўжо спасцігла на ўласным ілбе. І, хаця нічога выправіць ужо нельга, я зразумела, што мае вартасці — працяг вартасцей грамадства, як, адпаведна, і мае заганы, а лёс мой — ужо гісторыя.

Але я не хачу, каб яна паўтаралася рэхам бабулінага “Час быў такі...”, і не ведаю, што сёння мне рабіць з маім беларускім сэрцам у час, калі моцны народ не мае нічога супраць, каб у ім растварыўся народ слабейшы. Наўрад ці зменіцца і мой беларускі менталітэт, бо я не хачу гэтага. Мне зручна з ім, нягледзячы на тое, што ён не адпавядае запісу ў пашпарце.

1997

* * *

Водар ліпнёвы ягад
І багуну дурман...
Мой Беларускі Захад
Носіць тваё імя.



# ПЯШЧОТНАЕ



* * *

*Апошнім можа быць толькі дзіця,*
*а каханне апошнім не бывае.*

З народнага

Ужо не апалю,
Але яшчэ сагрэю:
Апошняе "люблю"
Ў сутонні агнявее,

Як бэзавы букет
У гронках ацяжэлых,
Вяргіняў шчодры цвет,
Святло рабіны спелай,

Прытомлены усход
І поўдзень – зыркі, шчыры,
І птушкі – не ў адлёт,
А, як штогод, у вырай!

Мой жнівень: знічак след
Над навіссю лістоты,
Твой вінаваты шэпт,
Гаркавы смак пяшчоты,
Пах палыну і мяты,
Як прадчуванне страты...

Ужо не апалю,
Але яшчэ сагрэю,

Апошняе "люблю"
Сваё ў табе пасею.

Адно каб прарасло
Сланечнікавай семкай
Ды сэрца не гняло
Учэпістаю стрэмкай.

Не, ты не вінаваты!
Я прадчуванне страты,
І гэты смак гаркавы,
І іншыя праявы
Сапхну у мех дзіравы
І з радасцю згублю.
Журбой перахварэю –
І – та-а-к цябе сагрэю!..
Хоць і не апалю.

## ДЗЕВЯЦЬ ДЗЁН У ГУРЗУФЕ

Як доўга, аднак жа,
шчыміць развітанне з табой
І колецца вострым
грудком неразлітага плачу…
Мяне безнадзейна цалуе
і лашчыць прыбой,
То высакародны карсар,
то спакушаны мачо.

І спее жаданне
аддацца яму спакваля,
Спатоліць і цела,
й душу у замглёнай прасторы
(Ну, прыкладна так,
як калісьці паўстала зямля
З гаючых абдымкаў
бязмежнага неба і мора).

Забыцца на зайздрасць
людзей і на літасць багоў,
Да вуснаў паднесці
бурштынную вільгаць такаю…
Ды востра істоту
пратне адчуванне таго,
Наколькі у гэтым раі
мне цябе не хапае!

Канечне,
яго нескладана ўтапіць у віне,
У моры ці ў скалах
наўмысна пакінуць, ды толькі
Даўно ўжо нехта
праўдзіва сказаў да мяне,
Як цяжка схаваць
адзіноту ў вірлівым натоўпе.

Магнолія ліпаю пахне,
жалейкай здаецца габой,
Ў абрысах экзотыкі
бачацца звыклыя рэчы...
І тлее жарынкай
чаканне сустрэчы з табой.
Я так не хачу,
каб было яно больш за сустрэчу!



* * *

Зляпіла зіма сакавік – абы з рук!
(А быць абяцаў не абы-якім.)
Што мне з таго, што звініць жаўрук
Званком не твайго мабільніка?!
Бачу і бачу назойліва ў сне:
Едзе вясна на с**а**нях.
Сабакі стаміліся. Нюхаюць снег
Чуйнымі насамі...

Рушыць да мора пагоды шукаць?
Не, іншае выйсце дай мне:
Забыцца на ўсё і да ранку блукаць
У нетрах тваіх жаданняў.

* * *

*...хорошо мне в несвободе,*
*в нежной и протяжной кабале*

Из песни

Адбрыкнуцца лянотна
Ад світальнага "кукарэку",
Рэшткі мрояў атрэсці,
Што змярэжыла ноч-начаніца,
І з-за кратаў пяшчотных
Такой пажаданай вязніцы
Бачыць зноў перакулены ветах
Залатой шкарлупінкай арэха...

## АМАЛЬ ПЕРАЙМАЮЧЫ СКАРЫНУ

Мусіш дбаць аб жытле і аб хлебе,
Бо што зробіш, што зробіш, калі
“Птушкі толькі спяваюць у небе,
А жывуць яны на зямлі”.

Хоць часінаю песні шчырай
К сонцу рвуцца яны, ды пасля
Адчувае стомлены вырай,
Што чакае яго зямля.

Пераблытаўшы вёрсты і мілі,
Абмінаючы мацерыкі,
Мкнуць туды, дзе іх шчыра любілі
І кармілі пяшчотна з рукі.

Гэтай мудрасці не зняважу,
Сум адпрэчу і неспакой,
Клеткі, любы, табе не зладжу
Ні жалезнай, ні залатой.

І ахрыплы, ці згаладнелы,
Ці прапахлы пылам дарог,
Прывандруеш ты, птах мой белы,
Шляхам Млечным на родны парог.

# СІМФАНІЧНАЕ



## ЖАНОЧАЯ МАНАЛОГІКА

– І чым я табе цікава?
Дальбог жа, не знаю.
У жылах – чорная кава,
Сама меней двайная.
У працы з самага ранку –
Тым і жыву.
(Не схочаш такому жаўранку
Скруціць галаву?)
У ёй, тым больш, – не флірт, не гламур,
Не часта і бігудзі...
Пакуль не падстрэліў цябе Амур,
Збірайся ды йдзі.
Не, я не супраць, каб ты цяпер
І назаўсёды знік!
Я знаю пра вас, паэтаў, – павер –
Усё. І не толькі з кніг.

Зайшоўся ад холаду ветаха рог,
Вядома, люты не май.
Ну, што ты нацэліўся за парог?
Хутчэй абнімай!..

* * *

*Вот дом, который построил Джек...*
Р.Бёрнс

Вот город, то сумрачный, то освещённый,
В котором возник странноватый дуэт:
Учёный, амурных волнений лишённый,
И кем-то всегда увлечённый поэт.

Союз изначально их был освящённый,
Но путали долго завещанный след
Учёный, в теориях искушённый,
И музой не раз обольщённый поэт.

Чьё ж первое радостно и обречённо
Ударило сердце волной в парапет?
Учёный был женщиной незащищённой,
Весёлым Стрельцом оказался поэт.

И каждый в себе, будто вновь обретённый,
Другой, отражённый, увидел талант:
Поэт наш – непраздною жизнью учёный,
Учёный, так скажем, – поэт-дилетант.

Средь взоров, завистливых иль отрешённых,
Прожить хоть бы с сотню надеются лет
Учёный, по-В**А**Ковски наречённый,
Отмеченный Божьей печатью поэт.

* * *

Тваё "Алёна"
Крылом анёла
Прашапацела.
Тваё "Алёна"
Сышло стамлёна
З прыпухлых вуснаў,
Ледзь-ледзь разднела.
Тваё "Алёна" –
Блакітам лёну
На зрэб'і лёсу,
Што быў праклёнам.
Тваё "Алёна" –
Галінкай клёна
Ў акне дзяцінства,
Што светла сніцца.

Кулі шалёнай,
Дзіды калёнай,
Слязы салёнай,
Ночы бяссоннай
Не кліч Алёнай!
Тваё "Алёна"
Хай несканчона
Мяне галубіць...
Чаго я плачу?
Ці ж ёсць іначай
У тых, хто любіць?

### . . .

*...ликвидировать различия*
*между городом и деревней*

Из планов

строительства коммунизма
Шпарка мільгаюць жыцця берагі,
Хоць ужо й досыць прытомлены вёслы...
Восень сагнала сушыцца стагі
Да гарадка на ускраіне вёскі.
Спаць неўзабаве палягуць снягі,
Спрэс пахаваўшы грамоў адгалоскі.
Хопіць маркоціцца, мой дарагі, –
Едзьма спрадвечныя сплочваць даўгі,
Покуль стаіць, развінуўшы шляхі,
Родны, бацькоўскі, юначы і свойскі, –
Твой "гарадок на ўскраіне вёскі"*...



* З верша Яна Чыквіна.

## **ПАД***СУМ***ОЎВАННЕ**

На маіх вагах – тры пуды жыцця.
Было з іх два пуды, не меней, солі.
Не дзіўна, што ў глыбінях пачуцця –
Густая лава з  радасці і болю.

Нямногае з таго, што адышло,
Ахвяравана ружам і бярозам,
Лірычнага ў жыцці няшмат было,
А лепшы камплімент –
“Мужчынскі розум”...

Гады, канечне, коцяцца з гары,
Ды неахвота падбіваць рахункі!

Вялікі дзякуй вам, мае сябры,
За словы вашыя і падарункі;
Жыццю за тое дзякуй, што дало
З кім святкаваць, і будаваць, і сеяць,
І адчуваць, і аддаваць цяпло,
Быць не адной “ў касцеле і ў пасцелі”...

Хоць блізка час, як незваротна ляжа
На стомленыя скроні сівізна, –
Не буду сумаваць, што ўжо ніхто не скажа:
“Ах, девочка, какие времена!”

. . .

*Дзве мовы у мяне…*

В. Тарас

От скорби душу отскрести
И отогреться
И партию жены вести
В регистре меццо.
А што народзіцца з начных
Глыбінь кантральта,
Няхай як рэквіем гучыць
Самоце й стратам.
Ты прачытай і не маўчы:
Світае рана –
Сваю пяшчоту уключы
Ў ключы сапрана.
“Болезнь отсутствия любви”
Не пустим к сердцу,
Разрушив подлый тромб в крови
Игривым скерцо!
Сугучча гэткае ў людз***я***х
Гасцюе рэдка,
Каб скрозь адгукваецца ў грудзях
Журлівым рэтра…

. . .

Когда-нибудь не будет, как когда-то,
“Когда-то” смоет вновь “когда-нибудь”.

Пускай не слепит солнце пред закатом
И ощутимее короче путь –
Не варта гэтым сэрца рваць: “Калісьці...”,
“Было” і ”не было” калькуляваць –
Лепш звыкла крочыць па апалым лісці
І зноў яго банальна рыфмаваць.

Об увяданьи представленья сдвинув
И зиму отодвинув на потом,
Клён расцветает и горит рябина,
Готовые всегда украсить дом.

Хачу з табою гаварыць і слухаць,
Ані не баючыся, што стамлю,
Хрысціцца і ... па  дрэве тройчы стукаць,
Каб не сурочыць кволае “люблю”.

# СУЗІРАЛЬНАЕ



## ЗІМОВАЯ ФАНТАСМАГОРЫЯ

*Не адчувае лес зямлі,*
*Зімою лес бліжэй да неба…*

А. Пысін

Фарбы і пэндзаль наўрад ці спатоляць,
А ўвекавечыць – такая патрэба:
Лес чорным камлём – у белае поле,
Белаю кронай – у чорнае неба.

## АБРАЗОК

Хіба назавеш сузіранне
Няплённым заняткам?

Хвойка – далонькай клопатнай
Над купінай-зайчаняткам.

## У ТУРАЎСКІМ МУЗЕІ,
## АБО ХОКУ ПА–БЕЛАРУСКУ

Стомленая гаспадыня
У пазамінулым стагоддзі
Упусціла з рук
Хлебную лапату.

Дзяржанне адбілася –
На неба выплыла поўня.



# НАСТАЛЬГІЧНАЕ



## ДУМКІ Ў ВАНДРОЎЦЫ

Захацела я зачыніцца –
І мяне не трымай ані! –
Там, дзе можна набгом напіцца
Адзіноты і цішыні,

Дзе завея самотным воўкам
Завывае між каміноў,
Дзе крыху засмучоным вокам
У сутонне глядзіць акно.

Так бывае ў бацькоўскім доме,
Калі ён яшчэ не пусты,
Дзе яшчэ ні нудзе, ні стоме
Не вяртаеш пазыкі ты,

Дзе дымок адмысловай корбай
У блакіце дзіркі шкрабе
І дзе мне так злачынна добра
Проста з думкамі пра цябе!

У снягах камяні як рыфы,
Мітусні і тлуму няма...
І на аркуш просяцца рыфмы,
Дасканалыя, як зіма.

* * *

Раскашуе слядоў суквецце
На сліпучых бязмежных гонях...
Не ў вазку я і не ў карэце,
А ўсяго ля акна ў вагоне.

Так далёка вока сягае –
Не зраўняецца і вавёрка!
Да улоння сіняга гаю
Прытулілася выспа ўзгорка,

Як міраж, па-крывіцку адметны,
Ці прыснёны казачны горад,
Ці то хутар майго маленства,
Ці сядзіба з гравюры Орды...

## ВЯРТАННЕ Ў ДЗЯЦІНСТВА

Тых у памяці знаходзіш,
Хто даўно тут не жыве,
Дзе зажураны калодзеж
Заблудзіўся у траве...
Вочы змружыўшы да болю,
Ўбачыш: полем хтосьці йдзе –
То ссівелая бабуля
І крыху сутулы дзед.

Не дайсці і не даехаць!..
Ой, як далека адсюль
Край “няп***у***жанага рэха,
Непалоханых касуль”,
Шэрых кнігавак і плісак,
Засяроджаных буслоў,
Што калісь тваю калыску
Ў дзюбах неслі над сялом,
Дуб на выгане пахілы,
Расцярушаны стажок...
Родны кут, балюча-мілы,
Мой Чырвоны Беражок.



# МІНОРНАЕ



. . .

Кахаю – і спадзяюся,
Што злічаны вехі не ўсе.

Ды ўжо не наведае бусел,
Дачушку не прынясе...



. . .

Мялю упарта жарству пакуты
Між камянёў цярпення.
...............................................
Куды лёс паставіць націск
У слове “мука”?..



* * *

Не выпадае махнуць рукой,
Бо праўда як свет старая:
Кахаюць не тых, хто прыносіць спакой,
А тых, хто яго адбірае!

* * *

Мо, табе страпянуцца,
Зноўку там апынуцца,
Дзе так шчыра смяюцца
І дзе хмары радзей
І ўсё-ўсё маладзей...

Можа, мне схамянуцца,
У былое вярнуцца,
З галавою, дазвання,
Каб не рыпнулі дзверы...

Ў перспектыве чакання –
Ампутацыя веры,
Амнезія жаданняў,
Асфіксія надзей...

* * *

Я отдала последний цент
За лиха фунт,
Пришла, поставив свой скелет
В твоём шкафу.
На предстоящие года –
"Лавацци" пуд.
Собой остаться б, навсегда
Оставшись тут...
Собачий лай,
Кошачий ор,
Синичий след.
Промокший сад,
Озябший двор,
В шкафу скелет...

* * *

З сон-травою, бы сон, паляны.
Мне б з табою туды не ў сне!
Ды ў радках тваіх зрыфмавана
Гэта ўсё без мяне. Да мяне.



* * *

*Полюби и жалей.*
Н. Рубцов

Даўні той студзень зблытаў сляды,
І чакаць давялося –
Як і належала – тры гады
Паабяцанага лёсам.
Ты ж ад яго, не скажу, не чакаў
Нічога. Хутчэй – не гэтага.
Прытомлена ў коле будзённых спраў
Білася сэрца паэтава.
Між тым, паўз дзяўчат,
Так поўных надзей,
І паўз бабулек з клункамі
Да нас прабіраўся ў натоўпе дзень
Першага пацалунка.
Нам загадаўшы адкінуць наўзбоч
Тое, што не збылося,
Раны ахвярна лячыла ноч
Літасці і мілосці.
Жыццё пражыць – не раз забаліць,
Як басанож па пожні.
З вуснаў чыіх, як матыль, зляціць
Пацалунак апошні?



Застылым прывідам на сцяне
Каго у тузе застане,
Натоліць трункам на палыне
Ноч развітання?
Звыкла паклічаш –
Нязвыкла ў адказ
Гуку не ўчуеш...
Ведаеш: прыйдзе гэтакі час.
Што ж мала мяне шкадуеш?..

* * *

Сур'ёзная. Сталая. Немаладая.
(Падкрэсліць патрэбнае.)
Была мая галава залатая –
Робіцца срэбная...



## КАХАННЕ

Трымценне жаўрука.
Далоні ў далоні.
..................................
Гарачая рука
На трапяткім улонні.
..................................
Калючая шчака
Ля схаладнелай скроні...

# АБВІНАВАЎЧАЕ



* * *

Как далеко остался день
Предвосхищенья и озноба...
Прикажешь примириться с тем,
Что ты – лишь мастер эпизода?
И я, пожалуй, не гожусь
Для роли вишни, даже зимней,
Но всё, что я тебе пишу,
По меньшей мере, эксклюзивно.

Самоуверен по-мужски,
Живёшь, не смея усомниться
В том, что, конечно же, близки
Слова “любовь” и “любопытство”.
...За эпизодом эпизод
Приспособляем тривиально
Привычку переправы вброд
К привычке жить концептуально.

. . .

Творчасць – гэта вечны сыход упрочкі ад тых, каго любіш.
В. Акудовіч

Я каля Вас адзінотай змучана,
І, мусіць, не Вы ёй рады дасце...
А ўсё таму, што ані не ўключана
Ні ў смутак я Ваш і ні ў радасці.

* * *

Ты праз далоньку, блізенька.
Табе няўцям, дальбог,
Што я – у “групе рызыкі
 сардэчных катастроф”*...

* З плаката ў паліклініцы.

* * *

*Знікла адчуванне закаханасці,*
*Прападае адчуванне свята.*

А. Белы

*Домогание есть счастье; удовлетворение есть лишь последний момент домогания.Счастье – быть сплошным желанием и вместо исполнения – всё новым желанием.*

Ф. Ницше

Маё святое аўтарскае права
Ты скасаваў і, склаўшы падрадкоўнік,
Каторы год ужо перакладаеш
Майго кахання сімвалы і знакі
На мову прозы: звычак, абавязкаў
Бясхібнага сямейнага жыцця,
Якое ўзнёсласць ветразяў пунсовых
Мяняе на трываласць парусіны
(Ці таннай і нямаркай мешкавіны),
Якому не ўласцівы летуценні,
Якое выдае пад лік абдымкі
(А ўсе, што не ў рэестры, пацалункі
Асудзіць хутка да вышэйшай меры),
Сцірае тэмбр пяшчотнага зладзейства,
Адпрэчвае ўсе згадкі і загадкі,
Малюе (ці прымройвае?) аблíччы
І цені. (Не заўсёды – у былым.)



І як такі панылы падрадкоўнік
Табе ўдалося скласці, я дзіўлюся!
(Ды так дзіўлюся, што аж часам плачу,
Ўхапіўшы той паныласці глыток...)
Ажыццявіць жа пераклад зваротны
Я, шчыра кажучы, і не спрабую:
Пра вартасці двайнога перакладу
Свет ведае, бадай, з часоў стварэння.

Як страшна жыць усё ж у прошлым часе!
Яшчэ страшней – адной там заставацца,
Нібы у сне, што сню з табою побач,
Пакутую, крычу і уцякаю,
А ты не чуеш: гэты сон не твой...

# ПРЫМРОЕНАЕ



* * *

Вечар прасуе вуліцы.
Ты, якога й не ведаю.
Жанчына. Шчабеча і туліцца.
А у тваіх вачах –
Пяшчота,
Такая скразная!
Яе таксама не знаю...

Адчуўшы жаданне жадання
Згарнуцца прыручаным зверам,
Ключ пацалуе дзверы.
Мера
Даверу
Памізарнее ў свеце...
Дасвеццем
Сонца пальцамі промняў
Пакратае тонкі плячук
І за тваёй рукою
Ўніз віжом слізгане...
Ці сніць я гэта хачу,
Ніхто не пытаў мяне.

# ПРЫТОЕНАЕ



. . .
Как до меня сказал поэт,
"И отойдут пустые муки",
Тьма будет тьмою, светом – свет,
Пока ты не разнимешь руки.

Когда сближаются тела,
Ты ощущаешь рук замками,
Что два легчайшие крыла
Растут под этими руками?

Чтоб, перебитые судьбой,
Они в пыли не волочились,
Не отвергай мою любовь,
Что б после с нами ни случилось.

Читаешь, куришь и молчишь...
Устал от этих лиро-бредней?
Так не хочу, чтоб стал ты лишь
Моей иллюзией последней,

Ведь с выжженной дотла душой
Чужую жизнь в свою не примешь.

Я буду сильной и большой,
Пока ты руки не разнимешь,
Пока высокая тоска
Рождает творческие муки, –
Я буду счастлива, пока...
Пока ты не разнимешь руки.

# BIHABATAE



## 2004–Й

Далековато в марте до весны,
Тяжёлые снега к капели глухи.
Но в этом никакой твоей вины,
Как, впрочем, никакой моей заслуги...
Обидами сердца обожжены,
Год високосный в дом ползёт на брюхе.
Не замечай, прошу, моей вины –
И это я впишу в твои заслуги.
Пусть к дрейфу попривыкшие челны
Вдруг взмоют ввысь,
Как на стремнине струги.
Сознаюсь: в этом нет твоей вины.
Покаюсь: в этом нет моей заслуги...

. . .

Пакуты не згубныя для творчасці – яе губяць дробныя клопаты.
Незапомнены класік
Циничный романтик,
Презревший свой жизненный стиль,
Давайте итог подведём:
Что я  сделала с Вами?
Не вьётся эпитетов рой
Вкруг понятия "штиль".
(Оксюморон утлый прибьётся:
Ведь штиль – не цунами...)
И видится часто
Уснувший в пучине "Варяг":
Желанье заглушки не рвёт
И в котлах не клокочет...
О, мой романтический циник,
Никто Вам не враг.
Но – голову страус всё глубже.
Иного не хочет.

* * *

Кастрычніцкім празрыстым ранкам
Сцякае пазалота з дрэў.
Ты быў няўрымслівым каханкам,
Са мной – аціх і пасталеў...

# МАЖОРНАЕ



. . .

*“Золотое сечение” - это такое сечение отрезка прямой, которое делит его на две части так, что большая часть является средним пропорциональным между меньшей частью отрезка и его полной длиной.*

Г.Ю. Айзенк.

*“Золотое сечение” - это такой возраст, когда форма и содержание ненадолго совпадают.*

Народная мудрость

Вслух рассуждать – вызывает сомненья,
Кому-то смешно, в самом деле:
Какое ещё золотое сеченье
При тронутом “ржавчиной” теле?

Это, конечно, не рок, не стеченье,
Но и не закономерно:
Рассчитывается золотое сеченье
Не в пятьдесят, наверно.

Но если не ноем, глядя в окно,
Живём со смыслом и густо,
Когда идей в голове полно,
В душе и в кармане не пусто,

И дышим неровно, пощады моля
Гортанными голосами,
И слышим, как сходит с орбиты земля.
Скрипя, как телега, осями
(И ей помогаем сами!..)

Так стоит ли охать над сединой
И прозябать в простое?
Запомни, скептик: не всем дано
Сечение золотое.

## НЯВЫДУМАНАЯ ГІСТОРЫЯ

Ізноў сакавік пацвярджае: дарма
Да шафы хінуцца.
Яшчэ раз упэўнішся: зноўку няма
У што распрануцца.

Дазволь жа такога сабе не сцярпець,
Старое – у клунак!
(Тым болей што змог за зіму патаўсцець
Не толькі рахунак...)

Наўрад ці так хутка прыспіш ты такі
Няўсцешлівы вынік.
Ледзь-ледзь абудзілі блакіт жаўрукі –
Памкнешся на рынак.

Блукаць табе тут да паўдзённай пары,
Купацца у слове,
Якім неўзабаве цябе гандляры
У нерат заловяць.

Бадай што ніколі не бачыў сусвет
Танней кан'юнктуры,
Ды вабна падманвацца на камплімент
Жаночай натуры.

Дапяўшы да рынку, чуць днее, здалёк,
Не будзеш губляцца:
Рашуча пачнеш даставаць кашалёк,
Купляць і ... купляцца!

. . .

*Стамляецца небам*
*і падае знічка…*

В. Бутрым

*Толькі не падаюць зоркі*
*У бабіна лета.*

А. Белы

Ў маіх асенніх нябёсах
Ціха, прывольна й стала.
Не наракаю на лёс я,
Што зорак тут меней стала.
Стратамі наталіўшыся,
Зберагаю ашчадна
Тыя, што засталіся,
Без смутку па тых ,
Што пап**а**далі…

* * *

Чем пишет судьба?
Лучом на стене?
Дождём на окне?
Углём на доске?
Волной на песке?
Иль на асфальте мелом?
Остаться хочу на её полотне
Женщиной в белом.

*Женщиной в Белом...*



## САЧЫНЕННІ

На дошцы было выведзена: “Самы шчаслівы дзень у маім жыцці”. Пяцікласнікі нарэшце ўгаманіліся і, атрымаўшы ад настаўніцы адказы, здаецца, на ўсе магчымыя і немагчымыя пытанні, пачалі пісаць, перабіраючы ў памяці дні свайго яшчэ небагатага на падзеі жыцця. Яна любіла назіраць за імі ў такі час. Але сёння чамусьці звыклага супакаення душы ў яе не было. Яго парушылі згадкі, навеяныя немудрагелістай тэмай школьнага сачынення. Трэба было прызнаць, што сама настаўніца наўрад ці справілася б з ёй.

... Яна была ўпэўнена: самым шчаслівым днём яе жыцця будзе той, у які вернецца з гэтай незразумелай (прынамсі, для яе) вайны муж. Яна мярцвела ад чутак, што ў тое ці іншае паселішча прывезлі некага адтуль, прывезлі ў цынкавай труне. Праўда, ніякай думкі, што гэта можа здарыцца з ім, яна не пускала ў сваю свядомасць, толькі неаднойчы лавіла сябе на тым, што бясконца паўтарае, як малітву, яго імя. І ўсё ж бяда хадзіла побач: неўзабаве ў цынкавай труне вярнуўся дадому сын знаёмай настаўніцы. Учарнелая ад гора жанчына абняла яе, нібы сваю дачку, і яны плакалі разам. Але на пахаванне яна не

пайшла, ухапіўшыся, як за выратаванне, за жахлівую ў сваёй прастаце выснову: “Калі мне наканавана гэта ўбачыць, то яшчэ паспею…”Да ўсяго дадалося і “суцяшэнне” другой жанчыны, якую іншыя (і яна дагэтуль) лічылі мудрай: “Вы не былі на могілках? Ну і правільна, навошта? Сёння іхні, а заўтра Ваш…”

Доўгі час пасля яна не магла знайсці супакою, і позні ія або вельмі раннія званкі ў дзверы прыводзілі яе ў здранцвенне. Тады ж яна, сама не ведаючы, што робіць, пісала маці: “Калі ён загіне, то і я пайду з жыцця… разам з дачушкай”. Толькі потым прыйшло разуменне, чым быў гэты ліст для маці, якая жыла на другім канцы рэспублікі.

Потым… Жыццё адкладвалася на потым. Але ўсё, што адбылося потым, не мела нічога агульнага з яе марамі пра самы шчаслівы дзень…

Хаця… Яе маленне, яе каханне – так казаў ён – зберaглі яму жыццё. І дзень, у які ён раптоўна і нечакана завітаў у іх родную вёску, дзе яна была з дачушкай на канікулах, зіхоткі дзень на пачатку жніўня, быў такі падобны на Самы Шчаслівы, такі блізкі да яго – бо да замены, казаў ён, засталося менш за месяц.

У іх было ўсяго тры гадзіны часу – рэшткі ягонай камандзіроўкі “ў Саюз”. У іх было ажно дзесяць тысяч восемсот імгненняў шчасця да яго ад’езду ў сталіцу, у аэрапорт, і апошняга адлёту ТУДЫ. Яна, правёўшы яго,

у вёску ўжо не вярнулася, бо неўзабаве пачынаўся навучальны год.

...Яе не спалохаў ранні званок у дзверы: яна даўно чакала яго. І сапраўды, прынеслі тэлеграму. Яна ўсміхнулася нязвыкламу свайму спакою і ўпэўненасці, рукі не дрыжэлі здрадліва-трывожна. Толькі здзівілася, зірнуўшы ў акно, бо ясны досвітак знянацку схмурнеў, а бэзавы куст амаль што слаўся па зямлі ад ветру, які наляцеў богведама адкуль. Надыходзячы дзень быў зусім непадобны на той, што ўжо трывала адбіўся ў яе ўяўленні. З гэтымі міжвольнымі думкамі яна разгарнула вузенькую палоску тэлеграмы: “Прыбыла замена. Хутка ўбачымся. Справы дрэнныя”. Ведаючы яго стрыманасць і заўсёднае жаданне ашчаджаць яе, яна жахнулася кантрасту першай і апошняй фраз. Схапіўшы з ложка цёплую дачушку, заплакала, загаласіла, не ўяўляючы, што думаць і што рабіць.

Але трэба было жыць і працаваць, і, амаль раздушаная невыноснай пакутай, яна ўсё ж некуды ішла, нешта рабіла, аб нечым з некім размаўляла, але, далібог, не змагла б растлумачыць, навошта ўсё гэта было. Бадай, ніхто ніколі на свеце так не чакаў нікога, як чакала яна паштальёна з новай весткай, і, каб сам паштальён ведаў гэта, то ён, канешне ж, хутчэй прынёс бы яе. Той ліст яна выхапіла са скрынкі на бягу, спазняючыся на злёт настаўнікаў-камсамольцаў, і разарвала канверт толькі седзячы ў першым радзе вялікай залы

Дома культуры. “Мая любая, я буду жыць толькі дзеля вас з дачушкай… Што заўгодна, толькі не турма…” Скакалі ўваччу літары, блыталіся недарэчныя думкі: добра, што не нафарбавала вейкі, так лягчэй схаваць слёзы. Аднак яны літаральна сплывалі з вачэй, як той вераснёўскі дождж па шыбах, якога яна нават і не адчула, выбегшы з залы пад няўцямныя позіркі прысутных. Стоячы пад залевай, ліхаманкава хапала словы: “…ехаў на “Урале» з апошняй камандзіроўкі з Тэрмеза… на павароце пад колы матацykліст… памёр на 5-я суткі… 18 год… мяне адразу пасадзілі ў камендатуру, каб яго сваякі-ўзбекі не…”

Дождж раптоўна скончыўся, на вымытым небе па-восеньску шчодра заблішчэла сонца. І гэта было так падобна на самы Шчаслівы Дзень, але яшчэ больш на адкрыты здзек, бо знешняе хараство так не пасавала да таго, што было ў лісце, што роспачна расло ў ёй!

… Адчай штурхаў яе, клікала каханне, калі яна, вясковая матуліна дачушка, якая не паспела яшчэ пабываць далей абласнога горада, дзе скончыла інстытут, сядала ў самалёт, што ляцеў на Ташкент. Тысячы метраў вышыні, тысячы кіламетраў адлегласці і, здавалася, усё яе існаванне ў часе, былое, цяперашняе і будучае, зліліся ў сямі гадзінах палёту ў невядомасць. А пузаты “кукурузнік” да Тэрмеза вытрас на паветраных ямах усё жывое з яе істоты, пакінуўшы толькі свінцовы цяжар бяды. Адступіла бяда, здалося,

толькі на хвілінку, калі ён, у цемры гасцінічнага пакоя, сказаў дрыготкім голасам: “Ты са мною”, і абняў яе, і прытуліў, і яна зайшлася ў гэтых пяшчотна-роспачных абдымках.

Трыццаць дзён, якія яны былі разам, зрабілі яе даслай і мудрай, разважлівай і цярплівай. Такіх урокаў жыцця яна да гэтага не праходзіла. Праўда, наіўна сябе да іх рыхтавала. Трэба было ісці да бацькі загінуўшага хлопца, які, па злоснай іроніі лёсу, працаваў у мясцовай міліцыі. Яна падрыхтавала сябе да таго, каб прасіць, плакаць, нават, паспеўшы ўжо заўважыць і адчуць цікавасць мясцовых мужчын да “белых” жанчын, пайсці на ўсё... Каб толькі ўратаваць мару пра Самы Шчаслівы Дзень! Дзякуй Богу, саракапяцігадовы маёр-узбек не ўбачыў у гэтым змарнелым ад гора дзяўчаці “роскошной блондинки”. Але не менш кашчунна прагучала з вуснаў бацькі іншая прапанова: “Вось адрас. Праз тры тыдні паставіш тут у гараж “Жыгулі”, а я табе дам распіску, што прэтэнзій не маю. Толькі ні слова маёй жонцы, бо скажа – сына прадаў”.

Пры гэтых словах яна намацала ў сумачцы стосік чырвонцаў (тысячу рублёў!), што прывезла з сабою, і жахнулася нязбытнасці сваіх мараў. Але прыязджалі з таго боку Аму-Дар’і яго сябры ці ад сяброў, бянтэжачыся, совалі ім тыя ж стосікі рознай таўшчыні – і так яна засвойвала на практыцы паняцце “афганскае братэрства”.

Засвойвалася, свядома ці не, і многае іншае: экзотыка гор з пакручастымі петлямі дарог, вузкіх вулічак старога Тэрмеза, цудоўных палацаў Самарканда часоў Шахерэзады, убораў і звычак мясцовых жанчын, паху хлебных ляпёшак і шашлыкоў, белага віна і зялёнага чаю... Усё гэта, замешанае на заўсёднай прысутнасці бяды, рабі-ла ўспрыманне свету абвостраным і нерэальным.

...Яна ўсё ж дачакалася таго дня, калі следчы эксперымент даказаў, што ён невінаваты (а "Жыгулі", незалежна ад гэтага, сталі па адрасе), і можна было вяртацца дамоў. Ён жа меўся яшчэ вярнуцца ў часць – гэта зусім блізка, казаў ён, ля перавала Саланг – і аформіць замену. Белы лайнер нёс яе ўсё далей ад яго, але, урэшце, усё бліжэй да шчасця. Так, прынамсі, тады ёй здавалася, бо вельмі многае – у тым ліку і Чарнобыль – магло, бадай, толькі прытрызніцца...

Празвінеў званок. Вучні, пакінуўшы на стале цэлы месяц шчаслівага жыцця, выбеглі ў калі-дор. А яна падрыхтавала дошку для старшакласнікаў: "Страчанае пакаленне і яго лёс у літаратуры". У адрозненне ад першай тэмы, гэтаю яна валодала дасканала.

## СУБЛІМАЦЫЯ1 , АБО З ХРОНІКІ МАРШРУТА № 7

Не шукайце гэтага слова ў айчынных тлумачальных слоўніках. Айчына – Айчы-на, суровая жанчына… “Опустите железный занавес, я не одета”. Усё тваё жыццё і жыццё тваіх дачок між тым – суцэльная сублімацыя. Ад скуранак і маўзераў да рыдлёвак і аранжавых камізэлек.

…На маршруце № 7 вы сустрэнеце жанчын інтэлігентнага выгляду і мужчын маргінальнага тыпу. Суіснаванне на аўтобусных пляцоўках гэтых дзвюх палярных груп лагічна абумоўлена. З Мужчынам у грамадскім транспарце можа звесці толькі Выпадак. Выключны. Бо ва ўсіх астатніх выпадках мужчыны ў стыльных гарнітурах і з гладка паголенымі тварамі паважна праносяць сябе за яго вокнамі, і прычым пераважна пасродкам службовых “Волгаў”, “Аўдзі”, “Вольва” і “Мерседэсаў”. Аблічча ж з адбіткам інтэлекту ніколі не было прыметай заможнасці. А ў транспарце, як і ў грамадстве, да якога апошні належыць, – пэўная сістэма каштоўнасцяў. Словам “цілігентка” ў “сямёрцы” лаюцца, часам дадаючы да яго якасны (нягледзячы на ўсю яго канкрэтную адноснасць) прыметнік, што

пачынаецца з 23-й літары рускага алфавіту. Паказчыкам гэтай заганнай якасці асобы ў нашым грамадстве і ў яго транспарце традыцыйна лічацца акуляры. Настойліва раю зняць іх з носа непасрэдна перад пасадкай, бо побач са “звыкла інтэрнацыянальным” наборам аўтобуснай лексікі кшталту “Куды я прайду, хіба на галаву”?” і “Едзьце на таксі!” здараюцца і такія рэгі-янальныя перлы з яскравай заявай аб намерах, як “Вось зараз трэсну па дубэльтах, дык і не ўстанеш”. Не ведаю як наконт ажыццяўлення гэтых намераў (бо яны зыходзяць ад птушынага выгляду, хаця і жвавай, бабулькі), а вось сесці сапраўды не сядзеш. Гэты ваш намер пахаваюць мужчыны ў шкарпэтках. Найбольш масава яны ездзяць на задняй пляцоўцы. Не тое каб на іншых ехалі без шкарпэтак, але на задняй гэта асабліва адчувальна. Сядзячыя мужчыны ў шкарпэтках засяроджана (яны менавіта так уяўляюць сябе збоку!) разглядаюць нешта праз заінелае шкло, за якім – непраглядная цемра зімовага ранку. Стаячыя – пры кожным тармажэнні нагадваюць кеглі, і толькі адзін цвёрда стаіць на нагах. На маіх. Дакладней, на адной маёй назе. Бо на другой стаіць мой непад’ёмны партфель. Я ўпарта цягаю яго, хоць сяброўка і ўшчувае: “Хто да цябе падыдзе, калі ты з гэткім партфелем!” А мне і не трэба, бо, калі глыбока задумацца, я вольная толькі ў ноч з 31-га на 32-е лютага, ды і то з 24-х да 25-ці гадзін...

Кажуць, нішто так не ўпрыгожвае жанчыну, як часовая адсутнасць мужа. Але кажуць і тое, што няма нічога больш пастаяннага за часовае. Можа, і праўда справа ў партфелі? Ды і ў капелюшы таксама. Яго на маршрут № 7 надзяваць увогуле не рэкамендую: скажам, у адзін з паня-дзелкаў, калі чыгунны гул напаўняе аўтобус пры самым нязначным датыканні адной мужчын-скай галавы да другой ці апошніх да апорных стоек аўтобуса, нечы зашмальцаваны рукаў ссуне ваш капялюш вам на вочы і вы моцна рызыкуеце праехаць свой прыпынак, бо рукі вашы не зусім па вашым жаданні моцна прыцi-снуты да вашага ж тулава, а паддзьмуць брылёк капелюша вышэй не ўдаецца ніяк. Часам да вашага тулава, прыкладна ў раёне паўднёва-заходняй часткі спіны, ужо зусім не па вашым жаданні, прыціснецца нешта не ваша. Пакуль вы будзеце ліхаманкава разбірацца ў сваіх супярэчлівых пачуццях, аўтобус выплюне вас на прыпынку "Мясакамбінат", і рука ваша міжволі пацягнецца да той самай часткі спіны з падсвядомым жаданнем сцерці з жахам убачаныя вамі ва ўяўленні сляды ганебнай блізкасці ў грамадскім транспарце... Не хвалюйцеся: гэты жэст застанецца незаўважаным у натоўпе студэнтаў, якія якраз і ёсць мэта вашых штодзённых вандровак. Званок-карміцель (праз 90 хвілін ён жа збавіцель) кліча вас "да станка", і хутка ад дрэннага настрою не застаецца і знаку. Часта з той прычыны, што ён змяняецца на вельмі дрэнны.

Напрыклад, тады, калі вы спрабуеце прыняць экзамен у студэнтаў, якія спрабуюць яго здаць, і на стале стаяць кветкі, і карабок цукерак з назвай “Отрада”, а выраз твару экзаменуемага яскрава зычыць вам замены ў гэтай назве “д” на “в”... Але вы не губляеце прысутнасці духу, бо ёсць на-дзея на поспех заўтрашняга семінара. Вы яшчэ не ведаеце, што ў час яго ў вас узнікне непераадольнае жаданне вылезці па галінах дрэва, што зазірае з вуліцы ў адчыненае акно аўдыторыі за спінамі студэнтак, адна з якіх пераканаўча даказвае вам, што ў творчасці Максіма Танка вядучая тэма – астралагічная, бо ён шмат пісаў пра астрог... І, магчыма, вы нават вылезеце, але толькі затым, каб заўтра зноў прыйсці да іх, бо іх нельга не любіць. Хто яшчэ ў такой ступені валодае крымінальным талентам выглядаць “очень убеднтельно, будучи совершенно несо-стоятельным”; хто, калі ваша рука пачынае выводзіць “здав.”, – не просіць, не! – глядзіць на вас так, нібы вы збіраецеся выдраць у галоднага отудэнта батон, які той ужо паднёс да рота. А ў час свайго нядзельнага шпацыру (радасці правінцыйнага горада!) вы паспееце даць некалькі кансультацый тым з іх, хто рухаецца вам насустрач, у чытальную залу, і ў некаторых адпадзе гэта патрэба, і яны павернуць назад, і пройдуць з вамі, і зноў вы прабавіце час у той кампаніі, якой марна хацелі пазбавіцца хаця б у выхадныя. А яны, удзячныя за пералічаныя (і яшчэ не) вашыя заслугі прапануюць заснаваць у каледжы званне для

выкладчыкаў накшталт Іаана Златавуста, недвухсэнсоўна адрасуючы яго вам. Калі ж ад прыліву ўдзячнасці ў вас зашкаліць крывяны ціск, яны вельмі міла будуць угаворваць вас паберагчы сябе і пайсці да медычкі, але з-за абрысаў гэтага альтруізму будуць выразна вытыркацца вушы іх са-праўдных намераў.

А потым настане дзень, калі празвініць той званок, які ўжо назаўсёды збавіць вас ад неабходнасці разам з імі ехаць на маршруце № 7, вызваляючы стомленае чэрава аўтобуса на звыклым прыпынку. І яны паедуць рознымі маршрутамі і ў розным акружэнні: нехта сярод інтэлектуалаў, нехта – лёс! – і з маргіналамі, а нехта панясе сябе як гаоспадар жыцця. Вы развітаецеся з імі і прывітаеце наступных… Гэтага вымагае ваша прафесія. І многага іншага. Не дазваляе доўга спаць і напуста марнаваць час, шукаць ісціну ў віне і крочыць за ілжэпрарокамі, крывадушнічаць і пустасловіць. Не дае спыніцца і заплысці глеем, хаця іншы раз хочацца толькі гэтага! Падымае і прад’яўляе свае патрабаванні: ад формы прычоскі да даўжыні спадніцы і колеру калготак. Дорыць пякельныя пакуты творчасці і вышэйшую радасць натхнення. Праклён і ўдзячнасць ёй за гэта.

---

[1]Сублімацыя — трансфармацыя сексуальнай энергіі ў іншыя віды энергіі, напр. творчую.
[2]Пераход цвёрдага рэчыва адразу ў газападобны стан, мінаючы цвёрды.

## НЕ КАЗКА
## ПРА ЧЫРВОНЫ ПАНТОФЛІК

– Ты яму не родная нават па азначэнні.

Мая мудрая – настолькі як і мажная, – сяброўка, як заўжды, мела рацыю.

– Родная – тая, што на-радзі-ла. Да таго ж нагадваю: першая жонка – ад Бога, другая – ад людзей, трэцяя – ад д’ябла... Усё не табе на карысць. Так што вырашай! І абавязкова – дачку. Наўрад ці ты здзівіш яго чацвёртым сынам!..

– А як жа доктарская? – спрабую нясмела супраціўляцца я.

– Маю падазрэнні, – пранікліва заўважае сяброўка, – што гэтае рашэнне ты прыняла адна-асобна, і толькі таму аднагалосна. Ды, урэшце, лічу за абавязак парадзіць, а выкручвацца – табе. Лепш пашкадаваць аб тым, што зрабіла, чым аб тым, чаго не зрабіла.

Я міжволі мусіла задумацца. Напаўзадушаная мара пра трэцяе дзіця пачала нечакана падаваць прыметы жыцця. Яе настойліва рэанімавала ўсведамленне таго, што гэта будзе яго першая і наша адзіная дачка. У чырвоных пантофліках...

Настаў дзень, калі яна катэгарычна заявіла аб сабе дзвюма чырвонымі рыскамі праз стужачку тэста на цяжарнасць.

– А чаму адразу «яна»? – маю сяброўку такая беспадстаўная ўпэўненасць здзівіла.

Аргументаў у мяне пакуль не было, і толькі невынішчальная інтуіцыя не дазваляла ўсумніцца.

...Усю наступную ноч у правым паўшар’і майго збітага з панталыку мозга выстройваўся непарушны ланцужок аргументаў з транспарантам “Табе гэта трэба?” Левае, між тым, па-здрадніцку падсоўвала малюнкі з комікса “А чаму б і не?”

Стаміўшыся змагацца, я няўклюдна перахрысцілася і ... поклічным званком будзільніка на досвітку звыкла акунулася ў вір службовых і грамадзянскіх абавязкаў, злачынна забыўшыся на крыніцу сумненняў... Да таго часу, пакуль яны з новай сілай не заварушыліся ўва мне. І гэта я адчула па-жаночы пранізліва...

– Віншую! – пасяшалася ўесці мяне сяброўка. – Ты ж хоць нарадзіць не забудзься, занятая наша!..

Яна ведала, пра што гаворыць: нараджэнне меркавалася на самую гарачую пару: сесія, абарона дыпломных, дзяржаўныя экзамены, справаздача за мінулы і план на будучы навучальны год...

– Вось-вось, і я пра тое ж, – сяброўка з асалодай дабівала ляжачага. – Хіба ж ты можаш адмераць студэнтам столькі шчасця сваёй адсутнасцю?

... Між тым, у належны час, штурхаючыся локцікамі і каленцамі, Яна прабілася на гэты свет.

Кожны з нас, бацькоў, наіўна верыў, што пад карункамі ружовага “канверта” ўбачыць калаж са сваіх дзіцячых фотаздымкаў. Ды дзе там!

– Паслухай, – мякка пачаў муж, – можа гэта не наша дзіця? Ты ўпэўнена, што блытаніна выключана абсалютна?

Праз гэтае "не наша" яскрава выступала: «не маё». Аднак я не збіралася абразіцца, бо сама задала сабе тое ж пытанне, калі ўбачыла Яе ўпершыню.

Бадай, памыліўся б той, хто палічыў бы дзяўчынку рыжай і зеленавокай – вельмі ж ужо нетутэйшым быў колер і яе валасоў, і вачэй.

– Та-а-к, – па-філасофску зазначыў муж, гле-дзячы сваімі карымі ў мае шэрыя, а потым, зноў жа з лёгкім сумненнем, крануў бялявую пасмачку на маёй скроні і пачухаў сваю смаляную, з амаль незаўважнай сівізной, патыліцу.

Але дома, вызваленая з пялюшак, Яна неяк вельмі ўжо па-мойму, смешна, чхнула і адтапырыла мезенчык зусім як тата. Лёд крануўся! Мы ўсё больш і больш пазнавалі ў Ёй свае рысы, расчульваліся, любілі яе, і сябе ў ёй, і адно аднаго…

"Девочка-красавится", — напісала некалі вугольчыкам на сцяне суседская першакласніца замест «красавнца». І гэта дзіўнае слова надзвычай пасавала дачушцы. Яна падрастала і… "красавилась".

– Паненка-сялянка, – не хаваючы ўсмешкі, чмыхаў бацька.

І сапраўды, нешта ў Ёй было ад праглыбінных продкаў "па кудзелі". Магла, уздыхнуў-

шы, прысесці на краёчак прыступкі, кінуўшы пульхныя ручаняты на прыпол у замілавальных фальбонках, амаль як прытомленая жнейка, прайшоўшы пад спякотным сонцам доўгім шнурам-постаццю. Магла, як шляхетная выхаванка Мары-інскай гімназіі, зазвычай па-жаночы годна павярнуць сваю лабаценькую галоўку з валасамі Колеру, Якога Не Бывае...

Бацька з няўклюднай мужчынскай пяшчотаю апекаваўся гэтым дзіўным стварэннем, накупляваў рознакаляровыя ахапкі недарэчна-мілых убораў і патрабаваў выплятаць, вывязваць і зачэсваць – пад неймаверныя капялюшыкі і панамкі – такія ж экзатычныя коскі, хвасточкі, кудзеркі...

Першымі, канешне ж, былі набыты чырвоныя пантофлікі. І вось яны стаяць, лакавыя, з залатымі гузікамі, чакаючы, калі ж падрастуць малюсенькія ножкі...

...Уранку яна выбіраецца са свайго ложка, імпэтна падае ў нашы падстаўленыя рукі і доўга мосціцца пасярэдзіне, расштурхоўваючы нас ружовымі пяткамі, якія нават і не падазраюць, што на свеце існуе ржышча.

Мы завём яе Варварай, прадчуваючы і чакаючы, што з гэтага ўтульнага кокана некалі вылупіцца стыльная, разумная Барбі. Мы разумеем, што проста абавязаны дажыць да свайго сярэбранага – а яе хаця б паркалёвага — вяселля і адсвяткаваць усё ў доме, які мы будуем. У двары капаюць ямы, рыюць траншэі, згружаюць блокі, дошкі, жалезныя

пруты. Я часта сню, як з гэтага хаосу паўстаюць абрысы даўняй мары.

І сліпучым сонечным зайчыкам то тут, то там на яве вынікае жывы, ужо зусім неспадзяваны цуд.

...Аднойчы я прачынаюся ва ўтрапенні, мне мроіцца, як на дно самай глыбокай ямы звальваецца чырвоны пантофлік з залатымі гузікамі – проста на завостраныя жалезныя пруты, – а за ім, выцягнуўшы ручаняты...

...Я выразна чую, як бразгаюць гузікі аб жалеза. Я бачу кроў. Боль і безвыходнасць працінаюць мяне, не даюць звесці анямелыя калені...

– Пацярпіце, жанчына, ужо ўсё скончана. – Урач кідае карэтку ў латок. Перш чым столь абвальваецца на мяне, я заўважаю на белай халоднай эмалі нешта пунсовае, памерам трошкі меншае, чым кокан...

# АКВАТОРИЯ НАДЕЖДЫ

*Вся любовь происходит из нужды и тоски; если бы человек ни в чем не нуждался, он никогда не полюбил бы другого человека.*

А. Платонов

*Пусть будет стыдно тому, кто плохо об этом подумал.*

Девиз Британского ордена Подвязки

Такая туча достойна была того, чтобы ознаменовать небо в Судный день, не меньше. В ее недрах зрело и ворочалось нечто зловещее, свинцово-черное, а края еще время от времени озарялись сполохами поглощаемого этим мраком солнца, будто третий ангел вскидывал, прилаживая к губам поплотнее, свою начищенную трубу.

Покончил с произволом ассоциаций первый же удар грома из подбрюшья тучи, который не испугал, а обрадовал: да это же просто летняя гроза! Дождь тоже не заставил себя ждать, но оказался далеко не просто ливнем – Арина восхищенно наблюдала за пальцами-струями, которыми с ладоней луж тянулась к небу сама земля.

Чувство, охватившее женщину в эти минуты, не было ни превосходством человека-царя природы, ни страхом ее раба. Это было какое-то отчаянное, колдовское веселье, вздымавшееся из потаенных глубин существа. Видимо,

так же ощущала себя далекая латгальская прародительница Арины, бросаясь в купальские росы где-нибудь в верховьях Даугавы.

– Девушка, угостите зонтиком! – послышалось за спиной Арины.

Она оглянулась только потому, что на этой остановке с поваленным “грибком” никого, кроме нее, не было. Это не означало, что Арина считала себя старушкой, но даже дочь ее уже была мамой. И хотя обычно они обе выглядели “на пять”, но дочь в свои годы – как правило, а Арина в свои – как исключение. Однако справедливости ради следовало отметить, что довольно часто именно так обращались к ней и женщины ее же возраста (о чем явно не подозревали). Это был высокий критерий истинности: миру давно известно, насколько Евины дочки искренни и великодушны к своей сестре…

Меж тем, повернувшись, Арина не увидела на лице подошедшего мужчины ни тени разочарования.

– Ну что ж, устраивайтесь, – приподняла она зонтик на вытянутой руке (мужчина был гораздо выше).

– Спасительница вы моя!

Он перехватил трость зонта в свою левую руку, а правой слегка приобнял Арину. Она смутилась, но ситуация, пожалуй, альтернативы не предполагала: за гранью зонта всякие проявления гордости рисковали быть, мягко говоря, подмоченными.

Надо было каким-то образом реагировать на такое неожиданное соседство. К счастью, мужчина так же непринужденно перехватил и инициативу:

– Теоретически такой потоп – моя стихия. Я ведь родился под знаком Рыб. Но, ей-богу, без вас мне сейчас было бы значительно менее комфортно. Хотя, представляете: рыба с зонтиком и в калошах?

Пожалуй, это был тот случай, когда Арина не обиделась на свое образное мышление (а сколько пакостей оно ей подсовывало, скажем, в студенчестве при изучении хирургии – колотых, резаных и рубленых ран!) и улыбнулась ему, мужчине и образу рыбы.

Незнакомец, правда, с рыбой у нее совершенно не ассоциировался. Скорее, с заглавной буквой Я. Лев, в худшем случае Телец или Козерог. Вот разве что царь-рыба… Что мужчина принадлежал к хозяевам жизни, было заметно сразу. Нет, не по золотым цепи или печатке (Арина покосилась на руку, приобнимавшую ее: даже без обручального кольца). Дело было в другом – даже на первый взгляд он был блестяще самодостаточен и как результат более чем достаточно самоуверен. Это сквозило в осанке, посадке головы, манере говорить. Он был явно не из тех, кто считает “менталитет” ругательством, “альфонса” комплиментом, а тургор путает с тремором.

Пока Арина анализировала, мужчина говорил:

– ...Виктор... В командировке...Семинар...- Хорошо себя чувствую в вашем городе, хотя, конечно, не Лондон... не Нью-Йорк...

Она, правда, так и не поняла, какой конкретно случай свел их на этой богом забытой остановке – думала о своем. Не о городе. Она его не любила. Пока не смогла найти – или хотя бы придумать, – за что полюбить. Видимо, эта нелюбовь у них с городом была взаимной. Получалось совсем как в песне, некогда услышанной и доселе не заживающей где-то там, где гнездятся тоска и боль: "С протянутой душою по улицам брожу, ни жалости, ни милости, ни денег не прошу..." Город был безжалостен к ней так же, как и к тем, кто протягивал руку за милостыней. Одно утешало: душа бестелесна и посему не рисковала быть ударенной или одаренной камнем. Но когда Арина видела в зеркале свои грустные глаза, в ней снова начинала звучать эта песня. Любила ее, пожалуй, только работа; она же была и всегда верна. Говорить о взаимности такой любви в последние годы Арина как бы и стыдилась, это становилось почти дурным тоном: предполагалось, что любимая работа – это работа исключительно за зарплату... В их неизменный тандем все настойчивее втиралось одиночество, с чем, по всей видимости, надлежало смириться.

– Вы, мне кажется, где-то очень далеко,– улыбнулся мужчина. – Возвращайтесь скорее, вон уже автобус показался.

Но радоваться было рано: дотянув до остановки, автобус заглох.

– Свечи залило... – буркнул шофер, и народ унылой цепочкой потянулся к центру города.

Арина с босоножками в руках и Виктор, держа над обоими начавший протекать зонт, замыкали шествие. Видно было, что он нисколько не тяготился ее молчанием, а напротив, оценил в ней слушателя, и говорил, говорил – о себе, о своей работе, – немного снисходя, но это совершенно не задевало.

– Интеллектуальный террорист, – подумала Арина, ничего в принципе не имея против подобного захвата, и улыбнулась.

Он же, видимо, решил, что она улыбается огромной радуге, соединившей темную и светлую стороны неба:

– Вот чудо! В самом-то городе, оказывается, и не капнуло.

Да, хороши же они были, вымокшие, с грязными брызгами на одежде (а она – босиком!) в скверике перед площадью. К тому же было так парно, что, казалось, на руках и ногах начнут пробиваться ивовые прутья. Или опята... Праздная публика поглядывала с сомнительным интересом.

– А знаете что, Арина, – пришел на помощь ее попутчик, – не зайти ли нам ко мне? Обсохнете, приведете себя в порядок.

Они стояли недалеко от гостиницы и – ирония судьбы – водораздел проходил имен-

но по этой линии. Арина впервые от начала знакомства поглядела Виктору прямо в глаза, перевела взгляд на руку, протягивающую ей совершенно беспомощный зонт и... с трудом удержала желание уткнуться лбом в совершенно чужое, но такое мужское плечо, припасть щекой к этой сильной руке.

...Из всей её одежды сухой оставалась только заколка в волосах. Из всей одежды на ней осталась только эта заколка. Но он не хотел, чтобы даже эта заколка была между ней и его руками. Руки мужчины бережно прикасались, задумчиво бродили по телу женщины, и оно льнуло и тянулось к ним, как совсем недавно земля тянулась к небу пальцами дождя.

...Кровать была односпальная и очень узкая. Потом оказалась уже не такой узкой, зато совершенно неспальной. Ласточки за окном неутомимо состригали с неба остатки тучи, и вот уже комнату залил теплый свет заката.

Вначале поцелуи Виктора были нежными, внимательными, повествовательными, а затем в них зазвучал откровенный вопрос – и был ее ответ, которого он ожидал...

Конечно, же Арину нельзя было назвать женщиной без опыта, но в данном случае никчемность его выглядела явственной, хотя под этот свой опыт она и подвела авторскую философию: отдаваясь, оказывала честь, а не поступалась ею. Бывало, что оказывать приходилось скорее гуманитарную помощь.

Здесь же она явно не востребовалась. Да и желание было только одно: как можно дольше зависеть от этого человека.

– Лучше быть нужной, чем свободной, – прятал голову в песок страус.

В мужчине не было ничего, что было бы Арине неприятно. Умные слова, ласковые руки, запах хороших сигарет.

– Извини, я много курю. Единственная плохая привычка. (Знал бы он, как дорого бы она дала, чтоб стать второй!). А все-таки я настоящая Рыба: не только удачно выплыл из потопа, но еще и волны выбросили именно на тот берег, где есть все для счастья. Спасибо тебе!

Он снова целовал ее, и она вовсе не хотела пом-нить о том, что Рыбы весьма благородны и отзывчивы на уровне поступка, – принимала условия его игры.

– Ты – чудо. Я хочу тебя видеть…

– Тебе кажется. Мне уже 300 лет. По крайней мере, 299 полных…

На этот случай у Арины тоже имелась своя философия: женщину второго круга жизни нельзя одновременно рассматривать и трогать. Если смотреть, то с трепетом издали, а если трогать, то только закрыв глаза. Он же разбивал все ее стереотипы и – о чудо! – звон осколков ничуть не выводил из состояния гармонии с окружающим миром. Она прислушивалась к такому непривычному звуку с легким удивлением. Ко всему про-

чему оказалось, что Арина и вовсе себя не знала. Виктор открывал ей ее тайны и за эти открытия ей же был благодарен. Ее губы, бедра, грудь – все будто бы просыпалось, оттаивало, вспоминало древний извечный ритуал… Он не торопился падать в водопад, удерживался на краю пропасти, удерживая и ее. Но она-то знала, что он полетит туда один, а она дождется его здесь, на краю обрыва (и вовсе не потому, что, как выражалась одна из подруг, у нее выпрямилась извилина удовольствия). Самая главная ее тайна оставалась быть известной только ей, и она не собиралась делать его обладателем этой тайны. Страус все же успевал вытащить голову из песка и вспомнить о преимуществах независимости… Но мужчине знать об этом не следовало: принятые условия игры не допускали ни тени, ни пылинки на блеске его самодостаточности. В короткие мгновения полета он был беззащитно-первобытен; в тартарары за ненадобностью проваливалось тщательно выстроенное здание его компетенции… Арина чувствовала одновременно гордость и неловкость, будто подглядела нечто, чего видеть не должна была. Примерно такой же парадокс восприятия у нее вызывали нашивки с группой крови на груди у гренадеров в камуфляже из спецформирований: все знали о них нечто интимное, что людям друг о друге обычно не известно. Будто бьется на виду у всех обнаженное сердце…

Арина подошла к окну, распахнула его.

Запахло разбухшей пылью. Ласточки еще дремали на проводах, но, видимо, уже собирались выкраивать пройму на востоке. Далеко не полярная ночь подходила к концу, карета угрожала превратиться в тыкву, а допускать этого сказка не советовала. Утро могло оказаться столь же безжалостным, сколько и солнечным.

Виктор, будто угадав ее мысли "по выражению спины", не настаивал, чтобы Арина осталась – уважал принципы!

...Прежде чем она осмелилась набрать его номер, многое в ее жизни изменилось. Бумажный погром в доме наконец локализовался в сто страниц диссертации. К тому же Арина осознавала, что, если бы она приложила такие усилия не на столь ухабистой дороге, какая выпала ей, уровень ее собственной самодостаточности мог быть гораздо более высоким. Но в любом случае Виктор должен был знать, какую роль он (пусть поневоле) сыграл в ее жизни.

Его голос в телефонной трубке был совершенно лишен модуляций. "Как автоответчик", – подумала Арина. Если учесть, что душа глядит глазами, а говорит голосом ,– выводы изначально напрашивались грустные. Да и сам диалог сильно смахивал на монолог – так отчаянно Арина старалась заполнить то и дело образующиеся в нем пустоты. Говорила о защите, о своих успехах в английском...

– It will be even better, my dear,– услышала она в ответ. – I hope you will understand

everything properly. Now I can't talk with you. And I don't think I will ever do.[1] Keep distance!..

Щелчок на том конце провода был точкой в этой последней реплике. Диалог прервался, а телефонная трубка в руках Арины еще долго повторяла равнодушно-металлическим голосом: ke-e-p… ke-e-p… ke-e-p distance…

1Тем лучше, моя дорогая. Надеюсь, ты все поймешь правильно. Сейчас я не могу говорить с тобой. И, боюсь, никогда больше.

## РЭЦЭНЗІЯ

Сочачы за развіццём літаратурнага працэсу, мы высачылі ў адной з правінцый з'яву, якая здолела вывесці нас са стану раўнавагі, што, у сваю чаргу, вырашылі зрабіць і з вамі. Чаго варта ўжо толькі назва гэтай, з дазволу сказаць, кнігі?! Ці шмат жанчын зрабіліся аўтаркамі толькі таму, што мелі няшча..., то бок шчасце, выйсці замуж за паэта? Міжволі бачыш жаданне дылетанта схавацца за надзейныя (раю больш пільна прыгледзецца да прозвішча рэдактара) плечы.

Прыкладна такую ж вартасць мае, на думку рэцэнзента, паўтаральны матыў сну і снення. Дапушчальныя два меркаванні: або лірычная гераіня – натура містычная, экзальтаваная, або яна ... проста шмат спіць! Дарэчы, умацоўваюць у апошнім і бясконцыя шматкроп'і. Пераконваешся, што шаноўны творца заўсёды некуды спяшаецца (прычым абсалютна не выключана, што зноў легчы спаць!) і не мае часу закончыць думку, таму дэлегуе такі абавязак свайму, трэба сказаць, звышцярпліваму чытачу. Аднак жа будзем справядлівымі: у такой асаблівасці аўтарскай пунктуацыі нам бачыцца і надзея на працяг, прынамсі, хаця б на пашырэнне тых раздзелаў, якія проста злачынна кароткія і складаюцца падчас з аднаго (!!!) верша. Аўтар, пераследуючы зусім відавочную мэту, кіруецца падманлівым перакананнем "Сцісласць – сястра таленту", не ўлічваючы пры гэтым, што талент з такой характарыстыкай злёгку пакульгвае. Насамрэч, нікому ж не прыходзіць у галаву адносіць людзей да паэтаў, кіруючыся выключна стэрэатыпам "Усе паэты – п'яніцы". Гэтак і ў сцісласці павінны быць яшчэ нейкія сваякі, інакш шаноўны творца рызыкуе ўвайсці ў гісторыю як аўтар "Даведніка тэлеграфіста", а не абяцанага літаратурна-мастацкага выдання.

Вока праніклівага даследчыка не можа не зачапіцца за адзінкавыя (сярод увогуле нешматлікіх, расцягненых, аднак, на сто

старонак якаснай паперы) рускамоўныя творы, і, што яшчэ горш, змяшаныя ў межах аднаго верша рускія і беларускія словы. Нам бачацца, па меншай меры, дзве прычыны гэтай недарэчнай з’явы: першая – бездапаможнасць аўтаркі на этапе падбору рыфмаў. Вось такім, мякка кажучы, няўхвальным чынам, чыста па-жаночы, яна, не валодаючы паўнатой грамадзянскай адказнасці, вы-кручваецца з працэсу рыфматворчасці. Другая прычына – занадта задоўжаныя пошукі аўтаркай ідэнтычнасці, досыць бесперспектыўная распрацоўка ёю радовішча “станоўчай маргінальнасці”.

Насцярожвае перавага, нават, не пабаімся гэтага слова, засілле, белага колеру ў змесце і афармленні кнігі, і прычыны такой антымастацкай з’явы абсалютна не падлягаюць ніякаму рацыянальнаму вытлумачэнню. Надае аптымізму выключна тое, што ніякіх слядоў блакітнага, ружовага і чырвонага не выяўлена. Рэцэнзент цалкам задаволены, бадай, адным: якасцю ілюстрацый, хоць і не ўпэўнены, ці ёсць у гэтым заслуга аўтаркі. Аднак жа, паслядоўна кіруючыся прынцыпам “Мы задужа гордыя, каб не быць справяд-лівымі”, прызнае, што, ставячы пад сумненне літаратурны талент, павінен аддаць належнае яе гаспадарчым здольнасцям. На гэтай, так бы мовіць, паэтычнай дзялянцы знайшлося месца і ягадзе, і цыбуліне, і гарбузу, без урону, аднак, для агульнай канцэпцыі зборніка. Да апошняй, між тым , у нас таксама ёсць сякія-такія заўвагі. Толькі жанчына можа вылучыць у якасці эстэтычнага крытэрыю ўласны зменлівы настрой, фарміруючы пачуццё віны за гэтыя змены ва ўжо ўпамянёнага намі паэта (ён жа муж, ён жа рэдактар), ды заадно і ў чытача , які ўжо дакладна не вінаваты перад ёю ні ў чым. Што датычыць якасных характарыстык такой эмацыянальнай няўстойлівасці аўтаркі, то яны , на нашу думку, выходзяць далёка за абсягі літаратуразнаўчай навукі. Паколькі ж напісанае застаецца, рукапісы не гараць, а некаторыя нават і не тонуць, запрашаем чытача да непрадузятага роздуму над старонкамі чарговага факта макул…, выбачайце, маскультуры.

Суровы самакрытык,
які пажадаў застацца невядомым.

Літаратурна-мастацкае выданне

**Алена Белая**

# КНІГА ЖОНКІ ПАЭТА

Рэдактар Аляксей Белы
Дызайн-макет Уладзіміра Гундара
Карэктары:
Марына Малатоўнік; Алена Камарова

Мастацкае афармленне
Алены Татарыновіч

У кнізе
выкарыстаны гравюры
Францыска Скарыны
Напалеона Орды

Падпісана да друку 05.12.2007
Фармат 60X84/16
Папера афсетная
Гарнітура Nimrod, FreeSetC
Рызаграфія
Умоўных друкарскіх аркушаў 2,88
Улікова-выдавецкіх аркушаў 3,1
Наклад 290 асобнікаў.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Заказ №

Надрукавана ў ВЦ "Новая школа"
214020, Расійская Федэрацыя,
г. Смаленск, вул. Смальянінава, 12